ЛЮСТРАДЗЁН

# Балтыі

мясьцінах Вільні й на могілкі Росы, якую правёў сябра рэдакцыі «Руні», гісторык С.Вітушка. Многія з дэлегатаў упершыню зьведалі там магілы слынных беларускіх грамадзкіх і культурных дзеячоў, пісьменьнікаў, навукоўцаў і ўсклалі кветкі на іхнія надмагільлі.

Пасьля вячэры былі сяброўскія, нікім незаплянаваныя спатканьні, імправізаваныя «круглыя сталы» аднадумцаў.

## 26 ліпеня

А 10-й гадзіне распачаліся чарговыя чытаньні-дыскусіі. У перапынку спаміж выступленьнямі пачала працаваць рэдакцыйная камісія зьезду, якая адрэдагавала тры галоўныя дакуманты: «Віншаваньне грамадзянам Беларусі і ўсім беларусам сьвету» (з нагоды чарговай гадавіны прыняцьця 27 ліпеня Дэкларацыі аб дзяржаўным сувэрынітэце), «Заява аб антыбеларускай дзейнасьці рэжыму Лукашэнкі», «Зварот да беларусаў-землякоў Балтыі», якія й былі прынятыя дэлегатамі.

Напрыканцы другога дня працы сабраліся тыя, хто займаецца друкам, кнігавыданьнем, інфармацыяй. Былі намечаныя канкрэтныя крокі ў справе ператварэньня газэты «Рунь» у газэту беларусаў Балтыі, у справе разьвіцьця сумеснага кнігавыдавецтва, абмену інфармацыяй. Добрыя парады выказалі беларусы зь Беласточчыны, якія маюць у гэтай галіне багаты плён і даўні вопыт.

Пасьля дыскусіяў і галасаваньняў у тым самым рэстаране з добрай лічбай «777» адбыўся разьвітальны абед, вясёлы й душэўны, са здраўніцамі за росквіт беларускае справы, зь вершамі й песьнямі. (Сьпяваў нават наш суворы Зянон Пазьняк). Па абедзе ўсе, хто не сьпяшаўся дамоў, наведалі арганізаваную ТБК выставу-продаж карцінаў віленскіх мастакоў-беларусаў, пра якую чытайце на апошняй старонцы газэты.

## 27 ліпеня

Апошні дзень пачаўся прэс-канфэрэнцыяй у Саюзе журналістаў Літвы, на якой зь беларускага боку прысутнічалі З. Пазьняк, Х. Нюнька, Г. Сурмач, З. Клыга, Г. Таўлай, зь літоўскага ж боку прадстаўнікі СМІ.

А ўвечары, напэўна, быў апошні круглы стол, прысьвечаны народнай песеннай спадчыны Віленшчыны, у якім прынялі ўдзел супрацоўніца Санкт-Пецярбургскай Акадэміі Мастацтваў, дачка вядомага беларускага паэта, фальклярыстка Галіна Таўлай, знаная ў Вільні й Польшчы сьпявачка народных песьняў Марыя Крупавес, гісторык Сяргей Вітушка, пісьменьнік Алег Мінкін. Галіна Таўлай яшчэ некалькі дзён заставалася ў Вільні, робячы вандроўкі ў раён і запісваючы рэдкія беларускія песьні. Нашая вядомая зьбіральніца фальклёру была настолькі ўражанае багацьцем песьняў Віленшчыны, што пастанавіла падрыхтаваць да друку асобную кніжку.

**А. М.**

### Заява аб антыбеларускай дзейнасьці рэжыму Лукашэнкі

Мы, удзельнікі II Зьезду беларусаў Балтыі, глыбока занепакоеныя ўзмацненьнем антыбеларускай палітыкі рэжыму Лукашэнкі. Груба парушаюцца асноўныя правы чалавека й мэтадычна зачыняюцца беларускія школы й іншыя навучальныя ўстановы. (У Менску, які налічвае 2 млн. жыхароў, амаль не засталося беларускіх школаў, дакладней — адна). Ажыцьцяўляецца небывалы ўціск на бацькоў, рыхтуюцца пляны ліквідацыі недзяржаўных беларускіх навучальных інстытутаў і вучэльняў. Маладое пакаленьне беларускае нацыі пазбаўляецца магчымасьці набываць веды на роднай мове.

Адбываецца мэтанакіраваная замена беларускіх кіруючых кадраў на кіраўнікоў рускае нацыянальнасьці, у бальшыні сваёй — на функцыянэраў савецкага КДБ. На сёньня толькі 8 працэнтаў беларусаў займаюць вышэйшыя кіруючыя пасады ў краіне. Існуе шмат фактаў, калі гэтакая адміністрацыя выдае загады аб забароне выкарыстаньня беларускай мовы ў справаводзтве, а суды адмаўляюцца прымаць заявы й касацыйныя скаргі, напісаныя па-беларуску. Функцыянэры міліцыі, спэцназу, унутраных войскаў, аддзелаў аховы (што непасрэдна падпарадкоўваюцца прэзыдэнту Лукашэнка) хапаюць людзей на вуліцах, арыштоўваюць і зьбіваюць толькі за тое, што яны размаўляюць па-беларуску. Пры гэтым вядзецца жорсткі перасьлед студэнтаў, моладзі й дзяцей, якія выяўляюць пашану да Беларусі й асьмельваюцца ўзьняць голас у абарону свабоды, дэмакратыі, роднай культуры й мовы. Студэнтаў за крытыку Лукашэнкі выключаюць з унівэрсытэтаў, а непаўналетніх вучняў 15-16 гадоў міліцыянты хапаюць,замыкаюць пад арышт, запалохваюць ды жорстка катуюць самымі бесчалавечнымі мэтадамі. Напрыклад, нацягваюць на галаву супрацьгазавую маску й перацiскаюць шлянг для доступу паветра. Апошнім часам зафіксавана дзясяткі такіх злачынстваў карных органаў Беларусі.

У краіне ўсталёваны рэжым кадэбоўскай, антыбеларускай дыктатуры, які праводзіць тыпова акупацыйную палітыку этнацыду й русыфікацыі, пры гэтым у цынічнай, антыгуманнай форме, парушаючы ўсялякія правы чалавека, якія павінныя паважацца ў цывілізаваным грамадзтве.

Мы, дэлегаты зьезду, абураныя гэтымі жахлівымі фактамі й антыбеларускімі дзеяньнямі дыктатарскага рэжыму ў Беларусі. Мы зьвяртаемся да беларусаў Балтыі, Польшчы, Амэрыкі, Канады, Англіі, Францыі, Аўстраліі, Украіны, Расеі, — да ўсіх суродзічаў у сьвеце з заклікам узняць свой голас у абарону правоў чалавека ў Беларусі, зьвярнуцца да ўрадаў, дэпутататаў парлямэнтаў й грамадзкіх арганізацыяў у сваіх краінах з прапановамі й патрабаваньнем праявіць салідарнасьць зь беларускім дэмакратычным супраціўленьнем дыктатуры Лукашэнкі, а перадусім паўплываць на ўрад, кіраўніцтва й палітычныя структуры Расеі, якія, зыходзячы зь імпэрскіх інтарэсаў, падтрымліваюць лукашэнкаўскі рэжым.

У міжнароднай супольнасьці ёсьць магчымасьць й «вагары», каб уплываць на абмежаваньне й ліквідацыю злачыннага антыдэмакратычнага рэжыму ў Беларусі. Але моцны голас і цьвёрдую пазыцыю павінны засьведчыць перш за ўсё самі беларусы.

*Дэлегаты II Зьезду беларусаў Балтыі*

### Зварот да беларусаў-землякоў Балтыі аб грамадзянстве Беларускай Народнай Рэспублікі

Дэмакратычныя й нацыянальна-патрыятычныя арганізацыі Беларусі распачалі акцыю прыняцьця сымбалічнага грамадзянства БНР. Мы заклікаем усіх беларусаў, незалежна ад краінаў пражываньня, падтрымаць гэтую акцыю. Акт прыняцьця сымбалічнага грамадзянства БНР патрабуе ад нас асабістай пазыцыі й рашучай волі. Гэтым актам кожны з нас выяўляе непрыняцьце акупацыйнага дыктатарскага рэжыму ў Беларусі, галасуе за незалежную й дэмакратычную Бацькаўшчыну. Праз прыняцьце сымбалічнага грамадзянства БНР кожны з нас выносіць прысуд пачварнай для нашага народу савецкай мінуўшчыне, галасуе за самастойную будучыню Беларусі.

Колькі не спрабавалі зьнішчыць, абылгаць Беларускую Народную Рэспубліку, гэта не ўдалося: яна й сёньня, захаваная дзеячамі беларускае эміграцыі, застаецца адзіным сапраўдным ідэалам нашае супольнае будучыні.

Падрабязную інфармацыю пра прыняцьце грамадзянства БНР можна атрымаць па тэлефоне: **0122 61 65 32.**

*Дэлегаты II Зьезду беларусаў Балтыі*



14 ліпеня 1998 году ня стала **Леваніда Сымонавіча Караля**, актыўнага дзеяча беларускага адраджэньня Віленшчыны, намесьнік старшыні ТБК, адказнага сакратара газэты «Рунь», аўтара шмат якіх артыкулаў у нашай газэце, сьпевака. Леванід Сымонавіч, вучань Віленскай Беларускай Гімназіі, годна працягваў справу свайго бацькі Сымона Караля, вядомага беларускага дзеяча-адраджэнца Заходняй Беларусі. Ён праз усё сваё жыцьцё і ў апошнія гады, нягледзячы на хворае сэрца, ніколі не баяўся ўзьняць голас у абарону беларушчыны. Ён быў да канца прынцыповы з нашымі ворагамі, а нам усім быў старэйшым сябрам, мяккім, зычлівым, які ўмеў дараваць чалавеку ягоныя слабасьці, ніколі не адмаўляў у дапамозе. Леванід Кароль быў надзвычай адукаваным чалавекам, выдатным працаўніком. Ён меў вельмі сьціплы характар, быў сапраўдным прадстаўніком старой віленскай беларускай інтэлігенцыі.

Хай зямля табе будзе пухам, Лявоне!

Рэдакцыя «Руні»
зьвяртаецца да чытачоў,
асабліва старэйшых векам,
з просьбаю дасылаць нам свае
й чужыя матар'ялы мемуарнага
характару на разнастайную
(не абавязкова беларускую)
тэматыку.
Спадзяемся на вашую
падтрымку й разуменьне
ў гэтай важнай для беларускай
гісторыі й выхаваньня новай
генерацыі беларускіх
патрыётаў справе.
Не забывайцеся на тое,
што вашыя ўспаміны, якія часам
з розных меркаваньняў
недааацэньваюцца вамі, —
каштоўнасьць,
якая не павінна сыйсьці ў нябыт.



Падчас працы зьезду.



Зьлева направа: М. Пруські, Я. Станкевіч, С. Карабач.

**16 жніўня 1998 году аб 11 гадзіне** на Зарэччы (Ужупіс) плянуецца асьвячэньне будынку касьцёла Сьв. Барталамэя. У выніку штодзённай трохмесячнай барацьбы за касьцёл вернікі-беларусы разам з кс. Янам Шуткевічам і івернікамі іншых нацыянальнасьцяў дамагліся свайго. Цяперака сьвятыня даведзеная да ладу, прыбраны дзядзінец касьцёлу. Багаслужбы будуць праводзіцца згодна графіка: на беларускай, польскай і літоўскай мовах.

Запрашаем усіх людзей на ўрачыстае адкрыцьцё першага беларускага касьцёлу!

*Старшыня каталіцкай сэкцыі ТБМ Віленскага краю*
**Хведар Грушэўскі**

## ПОСТАЦІ

# Сьветлай памяці Лявона Луцкевіча

Як цяжка пісаць пра тое, што ўжо год нямашака дзядзькі Лявона! Могілкі Роса. Разьвітаньне назаўсёды. Я казала: «Ты быў ня толькі маім дзядзькам, да якога я амаль штогод прыяжджала ў нашую цудоўную Вільню. Ты быў мне добрым сябрам, гонарам нашай сям'і, маім духоўным бацькам! Тое, што лёс Радзімы-Беларусі на першым месцы ў маім жыцьці, — твая заслуга!»

А цяпер Цябе няма... Ды засталіся ў памяці нашыя сустрэчы: Вільня, Менск, Гатчына, Ленінград, Манчагорск, дзе мы разам наведалі магілы Стэфана Луцкевіча й ягонай жонкі. Згадаліся доўгія вечаровыя размовы ў тваёй утульнай віленскай хаце, цікавыя радыёперадачы, з такою любоўю зробленыя табою... Мне заўжды было добра й прыемна з табою, я ганарылася й цешылася, што ў мяне быў ты.

Вялікі дзякуй табе, дзядзька Лявон, што праз цябе я ўсім сэрцам палюбіла Бацькаўшчыну. І не я іншыя. Па-ранейшаму гучаць радыёперадачы «Беларускае слова на хвалях літоўскага радыё», якія на працягу 8 гадоў ён рэдагаваў і агучваў. Цяпер іх вядуць ягоныя вучаніцы, Іна Бэйнар і Эдыта Шуневіч. Захаваўся напрамак і стыль перадачаў, мэта якіх будзіць гістарычную памяць, знаёміць слухачоў зь беларускімі дзеячамі, пераважна з тымі, жыцьцё й дзейнасьць якіх была сьцісла зьвязаная зь Вільняю, а самае галоўнае — паказаць, што мы, беларусы, былі ў гэтым горадзе, ёсьць і будзем.

На старонках газэты «Рунь» час ад часу друкуюцца зьмястоўныя артыкулы з сэрыі «Партрэты віленчукоў». Зьбіраць матар'ялы пра грамадзка-палітычных і культурных дзеячоў-беларусаў Вільні й Віленшчыны пачала яшчэ незабыўная Зоська Верас, а прадоўжыў гэтую крапатлівую працу ейны зяць Лявон. «Партрэты віленчукоў» гучалі ў ягоным аўтарскім выкананьні на радыё больш не пакінуў да самага скону. Пра Вільню, своеасаблівы, шматнацыянальны горад, напісана сотні кнігаў, выдадзена мноства альбомаў і праваднікоў па горадзе. Аднак кожны бачыць «сваю Вільню», і Лявон Луцкевіч паказвае Вільню беларускую, Вільню, дзе жылі й працавалі Л. Сапега, К. Каліноўскі, браты Луцкевічы, дзе на працягу некалькіх дзесяцігодзьдзяў працавала Віленская Беларуская Гімназія й Беларускі музэй імя І. Луцкевіча, выдаваліся беларускія газэты, часопісы, кнігі й рабілася шмат чаго іншага ў сьвятой справе беларускага адраджэньня. Такую Вільню, «беларускую Мэкку», паказаў у сваёй кнізе Лявон Луцкевіч і, безумоўна, кніга гэтая станецца сапраўдным сябрам-спадарожнікам для ўсіх, хто цікавіцца нашым старажытным горадам: пісьменьнікам, мастакам, студэнтам, навукоўцам, вучням дый проста беларускім турыстам.

Ён добра ведаў і Вільню іншых



*Лявон Луцкевіч у коле сваякоў і сяброў. 1989.*

адна: ты быў патрэбны ўсім. І той, хто хоць аднойчы пачуў твой голас, слухаў тваю гутарку, хоць раз павандраваў з табою па вулачках Вільні, беларускія шляхі якой ты так выдатна ведаў, — той назаўсёды захаваў у сваім сэрцы пачуцьце глыбокай удзячнасьці й пашаны да цябе.

Ты быў і вось цябе няма... Ціха ў тваім габінэце. Але засталіся лісты, здымкі, твой радыёархіў, рукапісы й твая любоў да Беларусі. Мы, твае нашчадкі, захаваем усё гэта й будзем несьці далей!

**Маргарыта Пярова**

28 ліпеня споўнілася роўна год, як перастала біцца сэрца Лявона Луцкевіча, шчырага беларуса, карэннага віленчука. На могілках Роса, каля помніка братам Луцкевічам, Антону й Івану, лягла сьціплая пліта з чырвонага граніту. На ёй высечанае імя й прозьвішча Лявона, даты нараджэньня й сьмерці.

Але тут, на могілках, спачыла толькі цела. Дух Лявона жыве далей, а тое, што ён рабіў праз усё сваё жыцьцё, працягваюць рабіць «Свабода» й на Літоўскім радыё. Лявон Луцкевіч стварыў галерыю з 50-ці такіх «партрэтаў», а гэта й знакамітыя, шырака вядомыя беларусы-віленчукі, такія як Б. Тарашкевіч, Н. Арсеньнева, Ф. Аляхновіч, Іван і Антон Луцкевічы, — а таксама й менш знаныя, часта няслушна забытыя, як, напрыклад, М. Краўцоў, Х. Канапацкі, А, Стэповіч, М. Пецюкевіч. «Партрэты віленчукоў» завяршаюцца партрэтам самога Лявона Луцкевіча, артыкул пра якога на просьбу рэдактара беларускага радыё «Свабода» напісала ягоная жонка Галіна Войцік. «Партрэты віленчукоў» — гэта вельмі каштоўны матар'ял, сабраны Лявонам Луцкевічам пра тых, хто ўсяго сябе аддаў беларускай справе, і хочацца спадзявацца й верыць, што яны калі-небудзь выйдуць асобнай кніжкай.

Зусім нядаўна пабачыла сьвет доўгачаканая Лявонава кніга «Вандроўкі па Вільні», кніга, у якую аўтар увасобіў сваю душу сэрца й любоў, да роднага гораду, дзе ён нарадзіўся, вучыўся, куды вярнуўся пасьля 10 гадоў лягернага жыцьця на далёкай Калыме, — які ён ужо народаў, што здавён жывуць у ёй. Нездарма пасьля экскурсіі па «польскай Вільні» кіраўнічка акадэмічнага хору з Вроцлава падарыла яму кнігу з прысьвячэньнем: «Паважанаму спадару Л. Луцкевічу, хадзячай гісторыі Вільні, з захапленьнем, пашанай і ўдзячнасьцю».

Сам Лявон не дачакаўся сваёй кніжкі. Яна мела быць выдадзеная ў Менску ў выдавецтве «Энцыклапедыя», але пасьля сьмерці Міхася Ткачова справа яе выданьня заглохла. І толькі цяпер, якраз у гадавіну сьмерці аўтара, яна была выдадзеная выдавецтвам ТБК «Рунь». Гэтая сьціплая кніжачка — найлепшы помнік ейнаму аўтару. Тыя, хто меў шчасьце слухаць апавяданьні Лявона Луцкевіча пра Вільню, чытаючы ягоныя «Вандроўкі», успомняць яго й пачуюць за радкамі ягоны эмацыянальны, усхваляваны голас, голас беларуса-віленчука, закаханага ў родны горад.

Кажуць, што чалавек жыве, пакуль яго помняць. Памяць пра Лявона Луцкевіча захаваюць ня толькі ягоныя блізкія, але і ўсе, хто сутыкаўся зь ім, каму ён дапамог вярнуцца да беларушчыны.

**Галіна Войцік**

# Калі бяда на Бацькаўшчыне — бяда паўсюль!

*(Працяг са старонкі 1)*

да ўлады як сілу палітычную.

Памятаю пазыцыю БНФ яшчэ ў 1993 годзе, калі мы абмяркоўвалі пытаньне пра будучыя выбары. Яшчэ сп. Баршчэўскі заявіў тады, што галоўным нашым праціўнікам на выбарах будзе КДБ. Сапраўды, усё тое, што адбывалася ў Беларусі, пачынаючы яшчэ з 1992 году, было ініцыяванае й фінансаванае КДБ: зьнішчэньне рэфэрэндуму, стварэньне кадэбоўскіх структураў у Радзе міністраў, заняцьце пасады дзяржсакратара Данілавым, куратарам КДБ Менскай вобласьці, высокія паўнамоцтвы генэрала КДБ Паўлава. Была створаная аплочваемая «Пятая калёна» — «Народное движение Белоруссии». За вельмі кароткі час КДБ, якая сталася сілаю палітычнаю, увяло прэзыдэнцтва й правяло прэзыдэнцкую кампанію. Непасрэдны ўдзел у гэтай кампаніі прымалі структуры ФСБ і КДБ Беларусі, якія фактычна зьяўляюцца прататыпамі савецкага КДБ і вядуць працу на карысьць Расеі.

Былі два варыянты: Кебіч і Лукашэнка. Асоба Замяталіна вяла дзіўную работу: агітуючы за Кебіча, Замяталін працаваў на Лукашэнку. У сапраўднасьці ж вялася пасьлядоўная, прынцыповая, крок за крокам абгрунтаваная палітыка, прадуманая да дробязяў. КДБ падчас тае кампаніі фактычна прыўлашчыў электронныя СМІ, газэты, друк, потым разагнаў парлямант, скасаваў Канстытуцыйны суд. Дайшло нават да на першы погляд сьмешнага. У 1994 годзе Лукашэнка пачаў на тэлебачаньні даваць тэмы школьных сачыненьняў. Але гэта быў не кур'ёз: пачалася татальная палітыка вынішчэньня ўсяго беларускага на этнічным і культурным узроўні, у выніку якога мы маем сёньня ў Беларусі тыповы акупацыйны рэжым.

Калі б мы мелі звычайную дыктатуру — уладу групы асобаў — дык яны б нацыянальныя й дзяржаўныя інтарэсы выкарыстоўвалі б на карысьць сваіх уласных. Аднак, калі праводзіцца акупацыйная палітыка, яна робіцца менавіта так, як я сказаў раней. У Беларусі фактычна адбылася ўнутраная акупацыя, чаму яе й цяжка распазнаць, бо калі б гэтая акупацыя адбылася пры дапамозе танкаў і ўваходу праз мяжу, дык усё б было відавочна. Тады б дзейнічалі іншыя акупацыйныя законы. А вы павінны ведаць, што на акупацыйны рэжым існуюць міжнародныя пагадненьні. Аднак Захад пакуль што не разглядае Беларусь праз прызму гэтых пагадненьняў, бо, я паўтараю, захоп улады ў Беларусі адбыўся рэваншысцкімі сіламі савецкага КДБ, нібыта дэмакратычным шляхам, праз звонку дэмакратычныя выбары. З пункту гледжаньня прафэсыйнай палітыкі захоп улады кадэбоўцамі быў праведзены сапраўды прафэсійна, з выкарыстаньнем унутраных агентаў. Вынік — ключавыя пазыцыі ў Беларусі сёньня занятыя людзьмі, якія працавалі й працуюць у КДБ, ФСБ і нават зьяўляюцца грамадзянамі Расеі. Так на пасаду намесьніка міністра КДБ Лукашэнка прызначыў грамадзяніна Расеі, палкоўніка ФСБ. І гэта зноў жа не кур'ёз, а прадуманыя дзеяньні кожнага акупацыйнага адміністратара, які ставіць задачу зьнішчыць усякія нацыянальныя, нават патэнцыяльныя магчымасьці ў справе стварэньня апазыцыі рэжыму.

У чым усё ж такі сіла гэтага рэжыму? На якую глебу ён абапіраецца? Гэта якраз і ёсьць той момант, які цяжка разумеецца ў краінах Захаду. Паколькі гэты рэжым рэваншысцкі, ён абапіраецца на рэваншысцкую ідэю адраджэньня СССР, нават у іншай мадэфікацыі. Вось гэтая ідэя, якая фактычна выявілася праз анэксію Беларусі, і знайшла падтрымку ў душах і пачуцьцях выхаванага па-імперску беларускага насельніцтва. Без выключэньня ўсе палітыкі Расеі падтрымалі ідэю гэтак званай «інтэграцыі», хаця адныя зь іх «величают» сябе дэмакратамі, другія — супэрдэмакратамі, трэція — ніяк сябе не называюць. Адным словам, сытуацыя, што склалася ў Беларусі, вельмі спэцыфічная. Мы павінны добра разумець, зь якіх крыніцаў чэрпае падтрымку акупацыйны рэжым, які паступова робіцца фактарам міжнароднай палітыкі й нават геапалітыкі.

У сытуацыі, калі нацыю зьняважылі й прынізілі забаронай нацыянальнай сымболікі, гэта быў жахлівы псыхалягічны ўдар для людзей, якія плакалі й вельмі цяжка ўсё гэта перажывалі. У такой сытуацыі найбольшую шкоды прыносіць пэсымізм, нявера ва ўласныя сілы. У нас няма падставаў да пэсымізму. У 1995 годзе была ўтвораная антылукашэнкаўская апазыцыя, якая пастанавіла шляхам імпічмэнту замяніць Лукашэнку. Гэтая пастанова была праваленая, бо пачынальнікі гэтай акцыі фактычна не ўплывалі на прыняцьце рашэньняў. Прыняцьце саміх рашэньняў было ў руках маргінальных людзей. Пасьля гэтага, напрыканцы 1996-га, ішла вялікая барацьба, якую можна назваць грамадзкім супраціўленьнем, недапушчэньнем анэксіі. Усе ахвяры, якія былі прынесеныя, сотні зьбітых людзей, моладзь, кінутая ў вязьніцы, арышты, эміграцыя, штрафы, — усё гэта не прайшло дарэмна. Мы не павінныя лічыць, што гэта была дарэмная барацьба. Мы дасягнулі таго, што спынілі актыўную анэксію Беларусі: праз міжнародныя структуры і ўнутраны супраціў, праз стварэньне канфліктных сытуацыяў паміж маскоўскімі палітычнымі групоўкамі мы гэтую анэксію прыпынілі. Варыянт маланкавай анэксіі не спрацаваў.

Сёньняшні этап, этап грамадзкага супраціўленьня, характарызуецца тым, што ўсе сілы, якія ў нас былі, кінутыя, як на пажары, на недапушчэньне зьнішчэньня незалежнасьці, і гэты пэрыяд мае свае спэцыфічныя мэтады барацьбы. Што рабіць цяпер? Старыя «пажарныя» мэтады ўжо не даюць належнага эфэкту. Мы сёньня павінныя праводзіць канцэптуальную

*(Працяг на старонцы 5)*

# Цярністы шлях да незалежнасьці

(Працяг са старонкі 1)

тейший монарх, твоему неограниченному милосердию».

Як бачна з прыведзенага факту, нічога новага не было прыдумана ў Адміністрацыі прэзыдэнта Рэспублікі Беларусь, калі дэпутатаў Вярхоўнага Савету прымушалі падпісваць такія самыя вернападданьніцкія лісты, а да тых, хто гэтага не зрабіў, прымянялі рэпрэсыўныя меры.

Аднак ні прыніжэньні, ні рэпрэсіі, ні турмы, ні шыбеніцы не змаглі скарыць беларускі народ. Лягічным завяршэньнем ягонай барацьбы за адраджэньне дзяржаўнасьці сталася абвешчаньне Беларускай Народнай Рэспублікі. Пастанова пра абвешчаньне незалежнасьці беларускай дзяржавы было прынятае 25 сакавіка на паседжаньні Рады БНР, і гэтая гістарычная пастанова значна паўплывала на разьвіцьцё нацыянальнай самасьвядомасьці беларускага народу. Менавіта тады была зацьверджаная дзяржаўная сымболіка БНР, якая зьяўляецца набыткам нацыі, а не палітычнага ладу, як тое да сёньня лічаць пэўныя палітыкі. Доказам правільнасьці гэтага сцьвярджэньня зьяўляецца той факт, што апрача краінаў, якія ўвайшлі ў склад СССР, у ва ўсіх іншых краінаў сьвету, дзе палітычны лад часам мяняўся некалькі разоў, — сымболіка не мянялася. У краінах, якія ўзьніклі на руінах СССР (Літва, Латвія, Эстонія, Расея, Украіна й інш.), дзяржаўнаю сымболікай зрабіліся іхнія даўнія гербы й сьцягі. Дзяржаўным гербам БНР была зацьверджана «Пагоня», якая, пачынаючы з XIY ст., была гербам ВКЛ, сьцягам жа БНР стала белая палотнішча з чырвоным пасам пасярэдку — адзін са сьцягоў, які мелі ваяры ВКЛ у Грунвальдзкай бітве 1410 году.

Са стварэньнем незалежнай БНР ніяк не маглі пагадзіцца бальшавікі, якія ў якасьці альтэрнатывы абвесьцілі 1 студзеня 1919 году ў Смаленску Савецкую Сацыялістычную Рэспубліку Беларусь, якая, на жаль, толькі на паперы была сувэрэннаю, незалежнаю дзяржаваю. У сапраўднасьці зь першых дзён ейнага йснаваньня ўсе вышэйшыя кіраўнікі рэспублікі прызначаліся Масквою, а напрыканцы 20-х гадоў і наогул пачала адраджацца тэорыя расейскага месіянства. Згодна з гэтай тэорыяй заваёва Расеяй іншых народаў трактавалася як дзяржаўная неабходнасьць, якая нібыта супадала з інтарэсамі саміх заваяваных народаў. Феадальна-манархічны мэханізм утрыманьня народаў у складзе Расейскай імпэрыі быў заменены ў Савецкім Саюзе камуністычна-партыйным «дэмакратычным цэнтралізмам», які па сваёй сутнасьці быў толькі цэнтралізмам. Усе захады дзеля нацыянальнага адраджэньня сталі лічыцца «контррэвалюцыйнай зьявай, скіраванай супраць дыктатуры пралетарыяту». Яскравым помнікам тых гадоў, калі Савецкі Саюз, кажучы словамі Леніна, стаў «турмою народаў», сталі дзясяткі Курапатаў раськіданых па ягоных агромністых абшарах.

Толькі ў 1990 годзе, калі ўжо зрабілася відавочна, што створаная бальшавікамі новая імпэрыя, Савецкі Саюз, як і прыдуманы імі сацыялізм, аказаліся нежыцьцяздольнымі, — рэспублікі пачалі прымаць пастановы аб дзяржаўным сувэрынітэце. Дарэчы, прыклад гэтаму дала Расейская Фэдэрацыя. Беларусь прыняла Дэклярацыю аб дзяржаўным сувэрынітэце 27 ліпеня 1990 году.

Дзяржаўны сувэрэнітэт, гаварылася ў Дэкларацыі, абвяшчаецца ў імя вышэйшай мэты свабоднага разьвіцьця й дабрабыту, годнага жыцьця кожнага грамадзяніна на аснове забесьпечаньня правоў асобы ў адпаведнасьці з Канстытуцыяй і міжнароднымі абавязкамі.

У жніўні 1991 году Дэклярацыі аб сувэрынітэце была нададзеная сіла закону, а сама Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь была прынятая 15 сакавіка 1994 году. Наша краіна зьяўляецца, згодна з Канстытуцыяй, унітарнай дэмакратычнай прававой сацыяльнай дзяржавай, якая валодае верхавенствам і паўнатой улады на сваёй тэрыторыі, самастойна ажыцьцяўляе ўнутраную й зьнешнюю палітыку.

25 сакавіка 1918 году, 1 студзеня 1919 году, 27 ліпеня 1990 году, 15 сакавіка 1994 году, — усё гэта этапы цярністага шляху Беларусі й нашага народу да незалежнасьці. Кожную з гэтых датаў можна ацэньваць па-рознаму, але яны належаць гісторыі Рэспублікі Беларусь, і нельга ніводную зь іх ануляваць.

Аднак прэзыдэнт Рэспублікі Беларусь Лукашэнка ў выніку падмены паняцьцяў і фальсыфікацыі вынікаў лістападаўскага (1996 году) рэфэрэндуму абвясьціў дзяржаўным сьвятам, Днём Рэспублікі 3 ліпеня, дзень вызваленьня Менска ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Такім чынам былі скасаваныя ўсе даты, якія абазначаюць пэўныя этапы пройдзенага беларускім народам шляху да дзяржаўнай незалежнасьці, а пры гэтым размытым аказаўся й сам дзень вызваленьня Менску, чым нанесеная вялікая крыўда франтавікам, для якіх 3 ліпеня заўжды будзе сьвятым. За скасаваньнем зь беларускага календара Дня Незалежнасьці Рэспублікі Беларусь (27 ліпеня) і іншых датаў (25 сакавіка, 1 студзеня, 15 сакавіка) трэба, я лічу, бачыць практычныя крокі ў справе зьліквідаваньня дзяржаўнай незалежнасьці й сувэрэнітэту Рэспублікі Беларусь. Пазбаўленая статусу дзяржаўнай нашая нацыянальная сымболіка. Зноў апынулася ў апале нашая родная мова. Людзям убіваюць у галовы, што Беларусь, нібыта, ня зможа пражыць без Расеі.

Галоўнымі дарадчыкамі беларускага прэзыдэнта сталі палкоўнікі расейскай арміі. Так, разьвіцьцё навукі й культуры аддадзенае ў рукі расейскага палкоўніка Замяталіна. Пры гэтым я хачу падкрэсьліць, што беларускай гісторыі вядомыя ня толькі прозьвішчы С. Уварава, М. Мураўёва й У. Замяталіна. Беларускі народ заўжды будзе ўдзячны рускім па нацыянальнасьці А. Герцэну, М. Дабралюбаву, М. Бакуніну, якія выказваліся за правы беларусаў на сваё самавызначэньне. Прыклад сваёй добрасумленнасьці паказваюць у сёньняшнія цяжкія часы рускія па нацыянальнасьці, дэпутаты Вярхоўнага Савету Рэспублікі Беларусь У. Савічаў і В. Шчукін.

Разам са скасаваньнем усяго, што нагадвала людзям аб пражываньні іх у краіне, якая здавён мае назву Беларусь, Лукашэнка й ягонае акружэньне, я лічу, паставілі вярнуцца да таталітарнага ладу. Менавіта таму побач з партрэтамі Лукашэнкі амаль заўжды на сьвяткаваньнях у Менску выносяць партрэты Сталіна. Пры гэтым заўважым, што ўжо і ў Маскве побач з партрэтамі Сталіна пачалі зьяўляцца партрэты Лукашэнкі.

У Рэспубліцы Беларусь пад прыкрыцьцём гэтак званага лістападаўскага рэфэрэндуму растаптаная Канстытуцыя, парушаюцца законнасьць, правы й свабоды чалавека. Для барацьбы зь іншадумцамі адраджаюцца мэтады Мураўёва й Цанавы. Дарэчы, першы зь іх прызнаваўся: «Очень часто я сажаю мятежников без малейшей вины, даже подозрения нет; ну, в таком случае я всегда думаю: посидит под замком, да подолее, быть может что-нибудь да отыщется. И что же вы думаете? Я был счастлив, что всегда что-нибудь за сидельцемто моим да отыскивал. Ну тогда и подай сюда!»

У Беларусі сфармавалася новая разнавіднасьць дыктатарскага ладу, які народ прозваў лукашызмам. На ўзбраеньне ўзятыя сацыяльная дэмагогія й папулізм, улады абапіраюцца на незадаволеных становішчам, што склалася пасьля пацярпелага крах бальшавіцкага сацыялізму й распаду Савецкага Саюзу. Радзімаю лукашызму стала Беларусь, таму што менавіта тут, як ні ў адной іншай былой камуністычнай краіне, затрымалася ажыцьцяўленьне рэформаў у сфэры перабудовы цэнтралізавана-плянавай эканомікі ў рынкавую. Прыцягальным лукашызм стаў і ў іншых краінах (Расея, Украіна й г. д.), дзе таксама ёсьць пэўныя цяжкасьці зь перабудовай эканомікі, дзе адрадзіліся камуністычныя партыі на тых самых ленінска-сталінскіх прынцыпах.

Сёньня лукашызм ужо становіцца міжнароднаю плыньню й прэтэндуе на стварэньне, па словах Лукашэнкі, «нябачанай дагэтуль у сьвеце» славянскай дзяржавы. Лукашэнкавы дарадчыкі адкрыта заяўляюць пра свае ймкненьні да валоданьня ядзернай зброяй. Усё гэта нясе вялікую небясьпеку. Таму неабходна аб'яднацца ўсім дэмакратычным сілам як у Беларусі, гэтак і ў іншых краінах, каб своечасова пазбавіцца ад лукашызму, як новай ракавай пухліны на целе грамадзтва. Беларусь павінна, як таго патрабуюць Дэклярацыя аб сувэрынітэце й Канстытуцыя краіны, стаць дэмакратычнай прававой дзяржавай і заняць сваё пачэснае месца ў сям'і эўрапэйскіх народаў.

*Старшыня Вярхоўнага Савету 13-га скліканьня*
**Сямён Шарэцкі**

# Калі бяда на Бацькаўшчыне — бяда паўсюль!

(Працяг са старонкі 4)

палітыку, а гэта значыць — палітыку, якая прапаноўвае пазытыўную канцэпцыю ліквідацыі дыктатуры. Сёньня зноў паўстае пытаньне пра ўладу. Калі нашая палітыка ня будзе мець дакладнай палітычнай канцэпцыі, або будзе мець, а ня зможа яе ажыцьцявіць, — дык гэта станецца моцнаю нашаю паразаю.

Хацеў бы спыніцца на пытаньні Вільні й Беластоку, тых людзей, якія маюць дачыненьні з палітыкамі, сродкамі масмедыі й грамадзкімі міжнароднымі арганізацыямі. Вельмі йстотна цяпер, каб праз інфармацыю, якую цяжка даваць зь Беларусі, Захад ведаў пра становішча на Бацькаўшчыне. Чым больш такой інфармацыі будзе давацца на розных узроўнях, тым больш міжнародная супольнасьць будзе разумець нас. Праблема ў тым, што краіны Захаду вельмі спэцыфічна падыходзяць да беларускага пытаньня ня толькі ў палітычным, але і ў ідэалягічным пляне. Там рэагуюць перадусім на парушэньне правоў чалавека — менавіта тут трэба насамперш шукаць кантактаў з палітыкамі Захаду: цераз парушэньне элементарных правоў асобы яны могуць зразумець небяспечнае для дэмакратыі палітычнае й сацыяльнае становішча, якое склалася ў Беларусі. Калі ж на Захадзе вядзеш гаворку пра этнагенацыд, пра тое, што людзей зьбіваюць палкамі толькі за тое, што яны размаўляюць на роднай мове, пра закрыцьцё беларускіх школаў і г. д., — рэакцыя такая: крыху паслухаюць і пачынаюць гаварыць пра штось іншае.

Мяркую, што мы маглі б ставіць абсалютна дакладныя пытаньні, насамперш у Польшчы й Літве, і асабліва ў сфэры інфармацыі. У Беларусі зараз вялікая патрэба ў праўдзівай інфармацыі, якая б ішла туды зь Беластоку й Вільні па-беларуску. Зь міжнароднымі законамі й нормамі тут усё ў парадку, трэба толькі праявіць адпаведную палітычную волю й зрабіць адпаведныя захады. Такая воля зараз канкрэтызавалася з боку Злучаных Штатаў Амэрыкі, асабліва пасьля выдаленьня амбасадара гэтае краіны. Сёньня ЗША гатовыя фінансаваць беларускія радыёстанцыі. Сёньня нам усялякаю цаною трэба запоўніць інфармацыйны вакум.

У Беларусі сёй-той кажа, што дыктатура моцная таму, што дэмакраты ня могуць аб'яднацца. Аднак сутнасьць праблемы ня ў тым, што дэмакратычны рух на Бацькаўшчыне разьяднаны, а ў тым, што гэтыя рухі й сілы слабыя. Пакуль мы ня здолеем зразумець, што можна перамагчы малымі, але якаснымі сіламі, на якую падтрымку заходніх краінаў можна разьлічваць, якія нашыя аргумэнты будуць у Эўропе ўспрынятыя, — да таго часу можна разьлічваць выключна на частковыя й абмежаваныя посьпехі й трымаць сытуацыю на стадыі рэанімацыі. Ня трэба спадзявацца на тое, што будзе эканамічны крызыс і людзі выйдуць на вуліцы. Ня выйдуць! Ня выйшлі раней і зараз не пойдуць.

Сёньня ў адрозьненьні ад нядаўняга мінулага мы маем прыкладна 2 мільёны сьведамых нацыянальна беларусаў. Гэта ёсьць вялікая сіла й зь ёю трэба працаваць. Канцэпцыі, якія прапаноўваюцца, павінны быць разьлічаныя на гэтую сілу. Безумоўна, пануючы ў Беларусі рэжым будзе імкнуцца разьяднаць яе, стварыць альтэрнатыўную сілу. Як да гэтага ставіцца? Як ставіцца да асобаў, якія супрацоўнічаюць з рэжымам? Ці трэба зь імі аб'ядноўвацца? Да гэтага пытаньня мы павінныя падыходзіць дыялектычна, бо калі зьнівэлюем усё, ня будзе ў нас тады аніякае палітыкі.

Аднак, паўтараю, самае галоўнае каб мы самі былі дакладна вызначанаю сілаю зь яснай канцэпцыяй, адпаведнай пазытыўнай праграмай й дзейснымі мэтадамі яе ажыцьцяўленьня. Калі мы ня будзем мець гэтага, ня будзе й посьпехаў. Напрыклад, што было б, каб ужо сёньня ўлада Лукашэнкі правалілася? Ці можа ўзяць уладу БНФ, аб'яднаныя дэмакраты, усе апазыцыйныя сілы разам? Не! Вінаватыя ў гэтым мы самі. Калі б Лукуашэнка сваю ўладу страціў, дык верагодней ад усяго, што яе перахапіла б гэтак званая «вэртыкаль», бо яна дзейнічае арганізавана, мабільна, нашпігаваная агентурай. Вэртыкаль сёньня ў выпадку правалу Лукашэнкі безумоўна мае іншую кандыдатуру на кіраўніка краіны. Таму вельмі важна нацыянальнасьведамым палітычным сілам мець дакладную пазыцыю, ажыцьцяўляць яе, — толькі тады мы можам спадзявацца на канструктыўную выніковую палітыку, на прызнаньне ў сьвеце.

Рэжым Лукашэнкі моцны нашаю з вамі слабасьцю, бо ня склалася яшчэ яму насуперак дзейсная сіла. Калі ж такая сіла зьявіцца, нават «вэртыкаль» за Лукашэнку галаву класьці ня стане. Яна пачне хістацца й распадзецца, як тое неаднойчы здаралася ў гісторыі фашыстоўскіх рэжымаў нашае плянэты.

*Старшыня БНФ*
**Зянон Пазьняк**



Вандроўкі па Вільні.

СЯЧКАРНЯ

# Справа N19126

## па абвінавачаньні Багдановіча Івана Антонавіча й Пецюкевіча Марыяна Язэпавіча ў злачынстве прадугледжаным артыкуламі 58-4 і 58-10 ІІ крымінальнага кодэксу РСФСР

*Памятаю, як у дзяцінстве быў уражаны сячкарняй — сялянскай ручной машынай дзеля здрабненьня саломы. Салома закладаецца ў латак і падаецца пад нажы. Круціш ручку, вялізнае кола-махавік набірае хуткасьць, а вострыя нажы пачынаюць сваю работу: жах-жах, жах-жах... Салома спрасаваным пластом вылазіць з латака, а нажы яго зразаюць, зразаюць... Такая вось бяскрыўдная сялянская «гільятына».*

*Калі пачаў працаваць у архіве КДБ — расшукваць справы беларускіх дзеячоў-адраджэнцаў — вобраз сячкарні адразу ўсплыў у памяці. Спачатку арыштоўвалі адных. Пад час допытаў усплывалі імёны іншых. Супраць іх таксама ўзбуджалі справу, арыштоўвалі, судзілі. Усплывалі імёны трэціх... «Сячкарня» КДБ працавала няспынна й з размахам. У адной толькі Літве было асуджана па крымінальных справах каля 80 тыс. чалавек. У былым архіве КДБ ЛССР захавалася 47819 справаў. Сёньня яны рассакрэчаныя, зь імі можна пазнаёміцца. Былыя рэпрэсаваныя, іхныя сваякі, гісторыкі прыходзяць у гэты архіў і пачынаюць сваё расьследаваньне.*

*Пачнём нашае расьследаваньне й мы. Спадзяемся таксама й на вашую дапамогу, шаноўныя чытачы. Калі вы ведаеце беларусаў-землякоў, арыштаваных і асуджаных тут, у Літве, дык пішыце нам. Апроч імя й прозьвішча пацярпелага пажадана ведаць імя бацькі, год і месца народзінаў, што будзе спрыяць хутчэйшаму адшуканьню іхных справаў у схронах былога літоўскага КДБ.*

Гэтая справа складаецца з пяці пульхных тамоў: тры тамы сьледзтва й дадаткі — справа пра канфіскацыю маёмасьці й справа назіральная. Дакументы спраўна падшытыя ў тэчкі, пранумараваныя. Кожны аркуш адпавядае, так бы мовіць, літары савецкага «закону»: пастанова «аб прыняцьці справы ў вытворчасьць», ордэры на арышт, фатаздымкі ў профіль і анфас, адбіткі пальцаў і г. д. На аркушах пакінулі свае подпісы начальнік аддзела сьледчай часткі МДБ ЛССР капітан Галіцын, сьледчыя старшы лейтэнант Пятроў, малодшы лейтэнант Букаўскас, — яны вялі допыты, пісалі абвінавачаньні. Судзілі ж пракурор Новікаў, судзьдзя Буркова, народныя засядацелі Пюрко й Філіпавічэне.

Цікава, як КДБ выйшаў на сваіх ахвяраў. Арыштавалі іх у 1952 годзе, але з дакумантаў выглядае, што «капаць» пад іх пачалі значна раней. Найбольш раньні дакумант — дзьве даведкі пра допыты Алёны Сокалавай-Лекант (20.01.49.) і Зоі Каўшанкі (09.02.49.). Гэтыя ведамыя нам беларускія дзяячкі былі ўжо асуджаныя й адбывалі пакараньне ў сталінскіх лягерох. На допытах у іх пыталіся пра Янку Багдановіча, ці ўдзельнічаў той у Беларускім Нацыянальным Камітэце (БНК) і ці езьдзіў на ІІ Усебеларускі кангрэс? Як бачым, ужо напачатку 49-га Я. Багдановіч быў пад прыцэлам КДБ. А Марыянам Пецюкевічам дык зацікавіліся, напэўна, яшчэ раней, бо парадкавы нумар Пецюкевічавай справы быў 19126, а Янкі Багдановіча пазьнейшы — 19129. Справы спачатку «раскручвалі» паасобку й толькі 18.09.52. злучылі ў адну, назваўшы арыштаваных «саўдзельнікамі ў злачынстве».

У красавіку 1949 году ў Вільні быў арыштаваны славуты беларускі дзеяч кс. Адам Станкевіч. Адным з асноўных абвінавачаньняў супраць яго быў удзел у БНК. Магчыма, ужо тады, зьбіраючы кампрамат на А. Станкевіча, КДБ выйшаў і на сьлед герояў нашага расьследаваньня.

З 49-га па 52-гі кадэбісты назьбіралі дастаткова кампрамату на Пецюкевіча й Багдановіча. Фактычна ўжо ўсё было вядома. У пастановах на арышт яны праходзяць як «актыўныя беларускія нацыяналісты». Іх абвінавачвалі ва ўдзеле ў БНК, выданьні часопісу «Шлях моладзі», утварэньні маладзёвай арганізацыі «Будучыня» й г. д. Былі падрыхтаваныя запіскі зь Дзяржаўнага архіву ЛССР і спэцсховаў бібліятэкі Акадэміі Навук, былі зробленыя вынятгкі з крымінальных справаў Ф. Ярэміча, С. Грынкевіча, А. Сокалавай-Лекант, Я. Шутовіча, А. Станкевіча. Выглядае так, што допыты былі патрэбныя КДБ толькі для таго, каб падцьвердзіць загадзя сабраныя матар'ялы й, самае галоўнае, маральна й фізычна зламіць свае ахвяры.

Уяўляю, як праходзілі тыя «допыты» — шматгадзінныя, часьцей за ўсё начныя. Героі нашага расьследаваньня трымаліся годна, стараліся заблытаць сьлёдзтва, адчапіцца адгаворкамі: «ня быў, ня ведаю, не памятаю...» Хаця, паўтараю, сьледчым і так было ўжо амаль усё вядомае й інфармацыя «выбіваная» на допытах для гэбістаў мела хутчэй рытуальнае значэньне.

Сьледзтва, пачатае 1 жніўня, скончылася 22 верасьня 1952 году. На васьмі старонках сьледчыя напісалі абвінаваўчае заключэньне, кожны пункт якога, як на маю думку, ёсьць праўдзівыя заслугі перад Радзімаю. Вось яны: М. Пецюкевіч і Я. Багдановіч разам выдавалі беларускі часопіс «Шлях моладзі», спрабавалі стварыць патрыятычную маладзёвую арганізацыю «Будучыня», прымалі актыўны ўдзел у працы БНК падчас вайны. Апрача таго Марыян Пецюкевіч спрычыніўся да выданьня часопісу «Калосьсе», быў сябрам партыі «Беларускі нацыянал-сацыялістычны актыў», у 1941 годзе абняў становішча дырэктара настаўніцкіх курсаў у Вільні, у 1942-ім быў школьным інспэктарам у Ашмянскай акрузе, публікаваў артукулы ў газэце «Голас Беларуса», чытаў даклад на юбілейнай вечарыне Ф. Аляхновіча ў 1943 годзе, як «кулак» быў высланы ў Сыбір, адкуль пісаў антысавецкія лісты сваім блізкім і знаёмым. Янка ж Багдановіч у гады фашыстоўскай акупацыі загадваў кнігарняй БНК, браў удзел у працы ІІ Усебеларускага кангрэсу.



Сядзяць зьлева направа: Я. Найдзюк, І. Тумаш (Шутовіч), М. Пецюкевіч; стаяць: Я. Багдановіч, У. Тарасэвіч, А. Шутовіч.

У кастрычніку 1952 году адбыўся суд. Прыгавор кожнаму — 25 гадоў лягероў, 5 гадоў пазбаўленьня правоў плюс канфіскацыя маёмасьці. У 1955 годзе, праз два гады пасьля сьмерці Сталіна, Камісія перагляду крымінальных справаў КДБ ЛССР зменшыла тэрмін да 10 гадоў.

Ва ўступе да нашай новай рубрыкі я пісаў пра «сячкарню». Вось як гэта выглядала ў справе N19126. Пасьля заканчэньня сьледзтва была падпісаная пастанова на вылучэньне матар'ялаў на скампраматаваных асобаў: Б. Грабонскага, Я. Найдзюка, Р. Падабед, П. Сергіевіча, Я. Шнаркевіча, І. Шутовіча, Я. Пазьняка, В. Багдановіча, А. Барвідзіса, Ф. Грышкевіча. Матар»ялы на іх перадаваліся ў апэратыўны аддзел МДБ ЛССР «дзеля дадатковай праверкі, прыняцьці мераў росшуку й арышту пералічаных асобаў». Некаторыя з гэтага сьпісу на той момант былі ўжо рэпрэсаваныя — размах кэдэбісцкай сячкарні быў, відаць, настолькі шырокі, што апэратыўнікі й самі ня ведалі пра гэта. З асобаў, пералічаных у сьпісе, найбольшая небясьпека пагражала віленчукам П. Сергіевічу, Я. Шнаркевічу, Р. Падабед, І. Шутовіч (іхныя прозьвішчы падкрэсьленыя чырвоным алоўкам). Гэтых людзей выклікалі на допыты ў часе сьледзтва й на суд. Думаю ўратавала іх толькі тое, што пасьля сьмерці Сталіна кадэбіцкая «сячкарня» трохі суцішыла сваю жудасную працу.

М. Пецюкевіч пасьля вызваленьне ў 1957 годзе выехаў у Польшчу. Я. Багдановіч вярнуўся ў Вільню. У 1972 годзе апошні спрабаваў атрымаць рэабілітацыю. Была ўзбуджаная новая справа. Зноў былі допыты, расьследаваньне, паводле якіх было пастаноўлена, што савецкія карныя органы асудзілі яго слушна і ў рэабілітацыі Я. Багдановічу было адмоўлена.

Абодва нашыя героі годна вытрымалі ўсе выпрабаваньні. Пасьля вызваленьня зь лягероў, як маглі, рупіліся пра беларускую справу. Напісалі каштоўныя ўспаміны. На жаль, у сваіх успамінах яны амаль нічога ня пішуць пра тое сьледзтва. Відаць, ім было балюча дый небясьпечна пра гэта згадваць. Аднак мы не павінныя забывацца на гэткія гісторыі, каб яны больш не паўтарыліся.

*Вядучы рубрыкі*
**Сяржук Вітушка**


## Віленскі пэдагагічны ўнівэрсытэт

па конкурсу атэстатаў набірае студэнтаў на 1 курс факультэту славістыкі па спэцыяльнасьцях:

- беларуская мова і журналістыка;
- беларуская і расейская мовы і літаратуры;
- беларуская мова і літаратура і гісторыя культуры;
- беларуская мова і мэтодыка пачатковага навучаньня.

**Навучаньне платнае.**

**Форма навучаньня: завочнае (5 гадоў).**

**Прыём дакумэнтаў – да 1.09.98.**

**1. Атэстат (копія) альбо дыплём вышэйшай школы (выпіска).**

**2. Мэдычная даведка.**

**3. 4 фотакарткі (3х4).**

**4. Выпіска з працоўнай кніжкі (калі ёсьць).**

Дакумэнты можна выслаць на адрас:
Baltarusiu kalbos, literaturos bei etnokulturos katedra
Vilniaus Pedagoginis Universitetas
Studentiu g. 39-527
2034 Vilnius
Lietuva
тэл.: 72-58-01, 73-18-41
тэл. у Баранавічах: 8-01634-70503

1. Дакумэнты прымаюцца асабіста ці дасылаюцца праз пошту на адрас унівэрсытэту. Пры перасылцы праз пошту далучаецца заява на імя рэктара ў свабоднай форме з указаньнем спэцыяльнасьці і зьвестак пра сябе.

2. $10 за рэгістрацыю дакумэнтаў і афармленьне візы ўносіцца асабіста пры падачы дакумэнтаў альбо пасьля прыезду на вучобу (калі дакумэнты перасланыя праз пошту).

3. Разам з выклікам на вучобу даецца інфармацыя адносна візы, жыльля, аплаты і г.д.

4. Віза падчас вучобы бясплатная.

5. Інтэрнат даецца пры наяўнасьці месцаў і аплочваецца студэнтам.

6. Аплата за вучобу пераводзіцца пасьля залічэньня праз банк, паштовым пераводам ці асабіста ў касу ўнівэрсытэту па прыезьдзе на сэсію. Тады ж падпіс-ваецца дамова паміж студэнтам і рэктарам ВПУ.

7. Дыплём на тэрыторыі Беларусі мае юрыдычную сілу.

8. $1 = 4 літы.

## БЕЛАРУСКІЯ КНІГІ

Марыян Пецюкевіч.
**У пошуках зачараваных скарбаў.** Выд. ТБК «Рунь», Вільня, 1998;

Лявон Луцкевіч.
**Вандроўкі па Вільні.** Выд. ТБК «Рунь», Вільня, 1998;

Чэслаў Кудаба.
**Па Віліі.** Выд. «Полымя», Менск, 1992;

Юліяна Вітан-Дубейкаўская.
**Мае ўспаміны.** Вільня, 1994;

Баляслаў Лесьмян.
**Пан Блішчынскі.** Вільня, 1994;

— можна набыць, замовіць або атрымаць у падарунак у дамках ТБК.

Набываючы ў нас кнігі, ты знаёмісься з новым, спрыяеш адраджэньню беларускага кнігавыданьня ў Вільні!

# БЕЛАРУСКІ СЬВЕТ

## «Якому Богу маліцца?»

Артыкул з такою назваю даслаў нам спадар **Юры Весялкоўскі** з Англіі. Гэта, хаця й сьціслае, але даволі зьместоўнае з арыгінальнымі думкамі дасьледаваньне ў галіне пакручастай гісторыі самых пашыраных сёньня ў сьвеце рэлігіяў. У артыкуле аналізуюцца прычыны рэлігійных канфліктаў і сутыкненьняў як у далёкай мінуўшчыне, гэтак і ў нашыя дні. Гэтыя складаныя пытаньні разглядаюцца аўтарам цераз прызму веруючага хрысьціяніна-беларуса, які дбае пра духовае выратаваньне свайго народу. У наступным нумары нашае газэты мы пачнем друкаваць цікавы артыкул сп. Весялкоўскага, які ў лісьце, дасланым разам з артыкулам, піша: «...жадаю арганізатарам II Зьезду беларусаў Балтыі творчай працы й посьпехаў супраць тых цёмных сілаў, якія імкнуцца на зьнішчэньне сапраўднай незалежнасьці Беларусі, каб зрабіць яе калёніяй Расеі!»

## Без асаблівага задзіўленьня

прачытаў у «Руні» (N14) фрагмэнт з інтэрвію спн. Галіны Сівалавай, якое яна дала менскай газэце «Знамя юности». Яе дзіўная пазыцыя, што літоўскія беларусы павінныя займацца адраджэньнем беларушчыны толькі ў краіне свайго пражываньня, у Літве, і ня ўмешвацца ў тое, што робіцца пад самым ейным носам у Беларусі, — мяне ніколькі не зьдзівіла. Гэтая пазыцыя пераклікаецца з пазыцыяй ейных «аднадумцаў» з Дзяржаўнага камітэту па справах рэлігіі й нацыянальнасьцяў РБ. У прыватнасьці, намесьнік старшыні камітэту сп. І. Яновіч нядаўна напісаў мне: «Паважаны сп. Ю. Гіль! ...ТБМ Віленскага краю павінна весці культурна-асьветніцкую працу перш за ўсё ў Літве, а не ў Беларусі.»

Шчыра дзякую за каштоўныя парады й спн. Сівалавай і сп. Яновічу, а ўсё ж хачу адказаць ім, чаму нашая арганізацыя праводзіць значную працу ў справе адраджэньня роднай мовы, гістарычнай памяці й этнакультуры на тэрыторыі Беларусі. У Докшыцкім раёне Віцебшчыны мы стварылі гістарычна-этнаграфічны музэй «Засьцянковая хатка», а пры ім бібліятэчку «Крынічка», якая налічвае ўжо каля 5 тысячаў тамоў. На базе музэю з удзелам жыхароў навакольных вёсак і гасьцей праводзяцца разнастайныя імпрэзы (нягледзячы на перасьлед і ўціск з боку мясцовага начальства). Патрэба ў нашай працы на Бацькаўшчыне ёсьць і пры гэтым вялікая. Няўжо Вам, спн. Сівалава, невядома, які наступ вядзецца там на самае вартаснае й сьвятое для нас, беларусаў: на мову, на векавыя традыцыі й культуру? Можа Вы гэтага й не адчуваеце. А я вось адчуў на ўласнай скуры, калі летась у чэрвені міліцыянты з Докшыцкага РАУС пабандыцку напалі на музэй, параскідалі там усё, а мяне самога кінулі за краты. За што? А за тое, што зрабіў у бацькоўскай хаце музэй, які стаўся моцным асьветна-культурным асяродкам усяго наваколься.

А зрабілі мы музэй з дапамогаю людзей як зь Літвы, гэтак і зь Беларусі, якія аднолькава любяць сваю Бацькаўшчыну Беларусь. Дый на Бацькаўшчыне добра памятаюць Вільню. Мая маці, Фэліцыя Гіль, заўсёды на Казюка пехатою йшла сюды, на Сьв. Кальварыю, а зь ёю прыходзілі людзі з кожнае вёсачкі, з кожнае хаты. А цяпер вось, наадварот, мы, віленчукі, едзем у родныя мясьціны, на бацькоўскі парог, каб зрабіць нешта добрае, чалавечае для сваіх землякоў. І робім гэта дзеля таго, каб Радзіма нашая сталася вольнай сярод іншых дзяржаваў, каб паўсюль гучала матчына мова.

Вось і нядаўна, 4-га ліпеня, у засьценку Вашунава прайшло сьвята прысьвечанае 5-годзьдзю нашага музэю. Усім было вельмі радасна, а для мяне гэта быў адзін з самых шчасьлівых дзён. Барацьба за мову — гэта барацьба за Беларусь, і весьці гэтае змаганьне трэба паўсюль, дзе толькі хто можа.

*Старшыня ТБМ Віленскага краю*
**Юры Гіль**

## Віншаваньне II Зьезду беларусаў Балтыі

прыйшло з Кансысторыі Беларускай Аўтакефальнай Праваслаўнай Царквы ў Амэрыцы ад ейнага сакратара **Барыса Данілюка**. Там, у прыватнасьці, сказана:

«Любыя праз Хрыста Суродзічы!

Наш збавец Ісус Хрыстос сказаў: «дзе двое ці трое зыйшліся ў Маё Імя, там Я сярод іх» (Мацьв. 18:20).

Сёньня Вы зьехаліся ў імя дагоднае нашаму Збаўцу справы... й мы ўпэўненыя, што Ён паміж Вамі. А зь Ім, хоць фізычна разьдзеленыя акіянамі, душою разам з Вамі й мы — духавенства й вернікі БАПЦ, што яшчэ прымушаная дзеіць вонках Роднага Краю...

Заклікаем, аднак, не абмяжоўваць... арганізацыйнага жыцьця толькі сьвецкімі справамі й інтарэсамі, а пашыраць і ўмацоўваць яго тварэньнем беларускіх праваслаўных парахвіяў...

Сьцеражы, Божа, Беларускі Край!»

Да віншаваньня сп. Барыс Данілюк далучыў паведамленьне пра падарожжа ў Вашынгтон 26 чэрвеня злучанай дэлегацыі БАПЦ, БНФ, БАЗА з мэтаю «азнаямленьня зацікаўленых беларускімі справамі амэрыканскіх урадавых дзейнікаў з абмежаваньнем рэлігійнай свабоды, у тым ліку й забароны БАПЦ у Рэспубліцы Беларусь, а таксама з... парушэньмі людзкіх правоў ды іншыя актуальныя пытаньні былі прычынай, зь якое злучаная беларуская дэлегацыя... наведала Вашынгтон». У складзе дэлегацыі былі а. архімандрыт Аляксей Драздоўскі (БАПЦ), сп. Сяргей Навумчык (БНФ), сп. Віталь Зайка (БАЗА). Дэлегацыя сьпярша наведала Дзяржаўны Дэпартамэнт. Там «а. архімандрыт Аляксей абрысаваў цяперашнюю рэлігійную сытуацыю ў Беларусі, дзе адступная ад евангельскіх мэтаў і скарумпаваная чужынская царква, у хаўрусе з таталітарнай дзяржаўнай уладай, далей трымае манаполь на адкрытую практыку рэлігійных патрэбаў праваслаўнага насельніцтва Беларусі, у той час, як родная Беларускаму Народу й накіраваная на ягонае духовае адраджэньне Беларуская Аўтакефальная Праваслаўная Царква знаходзіцца пад забаронай, а нават прасьледуецца. За прыклад гэтага прасьледаваньня а. архімандрыт прадставіў справу газэты «Наша Ніва», што толькі за зьмяшчэньне ў 1997 годзе велікоднага прывітаньня Першагерарха БАПЦ Мітрапаліта Ізяслава апынулася пад афіцыйнай пагрозай ад галоўнага пракурора Рэспублікі Беларусь закрыць выданьне».

Сп. Навумчык на сустрэчы ў Дэпартамэнце апісаў узмоцненыя захады, якія сёньня робіць рэжым Лукашэнкі з мэтай зьнішчэньня беларускай мовы, літаратуры, культуры, закрануў пытаньне парушэньня правоў чалавека ў Беларусі, «зь непакоям згадаў рост распальваных з Расеі фашысцкіх і антысэміцкіх настрояў у Беларусі, што карыстаюцца падтрымкай шматлікіх афіцыйных дзейнікаў».

Сп. Віталь Зайка закрануў у сваім выступленьні пытаньне палітычнага прыстанішча й палёгкі візавага рэжыму для жыхароў Беларусі.

Аналягічныя спатканьні тым самым днём адбыліся з амбасадарам ЗША ў Беларусі сп. Даніэлам В. Спэкардам (адкліканым пасьля нядаўніх падзеяў у Драздах у Вашынгтон) і ў Гэльсінскай Камісіі.

Сваімі візытамі злучаная беларуская дэлегацыя «ня толькі асьвяжыла ўвагу амэрыканскіх урадавых дзейнікаў да беларускае справы, але й прадставіла ім праўду, што ўзнаўленьне Беларуске Аўтакефальнае Праваслаўнае Царквы ёсьць неабходнай умовай пабудовы беларускае дзяржаўнасьці й дэмакрацыі ў ёй,» — так заканчвае сваё паведамленьне сакратар Кансысторыі БАПЦ **Барыс Данілюк**.

## Зварот

### да суполак беларускай дыяспары ў Расеі ў сувязі з прапановаю правядзеньня гэтак званага «Зьезду беларусаў Расеі ў Башкартастане»

за подпісамі старшыні Рады Беларускага грамадзка-культурнага таварыства ў Санкт-Пецярбурзе сп. **Валянціна Грыцкевіча** й старшыні Маскоўскага таварыства беларускае культуры імя Ф. Скарыны сп. **Генадзя Леха** дасланы нам у рэдакцыю. У Звароце зноў узгадваюцца падзеі, якія не без «дапамогі» беларускага КДБ разгарнуліся на Другім зьезьдзе беларусаў сьвету й пасьля яго ў справе падрыхтоўкі калабаранцкага па сваёй задуме зьезду беларусаў Расеі ва Ўфе, аналізуецца дзеля якіх здрадных мэтаў патрэбны гэты зьезд дыктатарскаму рэжыму ў Беларусі, прапануецца стварыць Хаўрус Беларусаў Расеі й Беларускага нацыянальна-культурнага цэнтру, абгрунтоўваецца альтэрнатыўная прапанова правядзеньня такога зьезду ў Маскве. Магчыма ў наступным нумары «Руні» мы больш падрабязна пазнаёмім чытачоў са зьместам гэтага Звароту, у якім, ёсьць шмат цікавых фактаў з нялёгкага цяпер беларускага жыцьця ў краінах СНД.

## Ліст зь неардынарнымі прапановамі

даслаў нам сп. **Язэп Паўловіч**, незалежны дасьледчык й прадпрымальнік зь Менску. «На маю думку, — піша ён, — каб хаця неяк палепшыць цяперашняе становішча й пераадолець раскіданасьць суполак... трэба вырашыць дзьве задачы: знайсьці накірункі, дзе б маглі працаваць разам розныя плыні беларушчыны; пераадолець наступствы татальнага псыхалягічнага ўціску на наш народ, які пачаўся яшчэ перад падзелам Рэчы Паспалітай і асабліва ўзмацніўся пасьля 1944 году, калі набыў характар псыхалягічнай вайны». Аўтар ліста перакананы, што вырашэньню гэтых задачаў павінна будзе спрыяць задуманае ім грамадзкае аб'яднаньне навукова-дасьледчага й культурна-асьветніцкага характару. «Я пераканаўся, — абгрунтоўвае свае намеры сп. Я. Паўловіч, — што ва ўмовах, якія існуюць сёньня ў Беларусі, дзейнасьць і магчымасьці ўсіх партыяў, — завузкія й вельмі абмяжаваныя. Таму асноўным напрамкам лічу пашыраную асьветніцкую працу. Здаецца, найбольш эфэктоўным будзе выкананьне пэўных практычных праектаў і праграмаў зборнымі беларускамоўнымі гуртамі. Карыснымі, напэўна, будуць зараз і дзеяньні, скіраваныя на на вяртаньне ў сучасны ўжытак культурных здабыткаў нашага народу хаця б у выглядзе інфармацыйных копіяў, калі немагчыма здабыць арыгіналы».

Задуманы сп. Паўловічам Цэнтар «будзе праводзіць дасьледаваньні... ў галіне геафізыкі й экалёгіі з пункту гледжаньня бясьпекі й выжываньня», а таксама ў галіне гісторыі, культуры. Бярэцца шырака заняцца выдавецкай дзейнасьцю, стварэньнем праграмаў дапамогі этнічным беларусам.

Усіх, хто б зацікавіўся ў існаваньні гэткага Цэнтру сп. Паўловіч просіць зьвяртацца на адрас: **220005 Менск, а/с 51, Язэпу Паўловічу.** Тэл: **0172 84 62 06**.

## Суд над беларускай мовай

Газэта «Наша Ніва», атрымала папярэджаньне ад Дзяржкамдруку РБ з прэтэнзіяй, што газэта друкуецца ня тым правапісам: не афіцыйна прынятай «наркомаўкай», а «тарашкевіцай». Не чакаючы другога папярэджаньня (а гэта адначасна й закрыцьцё газэты) нашаніўцы абскардзілі ў судзе самую гэтую беспадстаўную прэтэнзію.

Працэс распачаўся 12 жніўня ў Вышэйшым гаспадарчым (!) судзе й тады ж быў адкладзены на два дні. Судзьдзі былі вымушаныя прызнаць некваліфікаванасьць судовага заключэньня і стварылі адмысловую экспэртную камісію.

Сёньня, 14 жніўня, гэтая безпрэцэдэнтны працэс будзе мець працяг.

**В.К.**



*На ганку былой Віленскай Беларускай Гімназіі.*



Малюнак Алега Аблажэя

# З намі кружыцца ўвесь парк

## Зьмей

Маленькі, папяровы зьмей
Ля воблака лунае:
— Я паляцеў бы і вышэй,
Ды Стасік не пускае!
(*Паводле* **І. Муравейкі**)

## Карусель

Карусель, карусель,
Хто баіцца — той кісель,
Той ня лётчык, не марак,
Хоць на выгляд здаравяк.
Карусель — на дваццаць пар,
З намі кружыцца ўвесь парк.
Мчацца дрэвы і кусты,
Едуць гмахі і масты.
Мы разгон такі ўзялі —
Не відаць ажно зямлі!
(*Паводле* **А. Пысіна**)

## Самакат

Рады я, і рады брат:
Нам купілі самакат.
Ён завецца «Мэтэор»,
Мы аб'езьдзілі ўвесь двор.
Эх, імчыцца самакат!
Апярэдзіце? Наўрад!
Мы сакрэт адкрыем вам —
Самакат ня едзе сам.
Едзем мы — працуюць ногі...
Разявакі, прэч з дарогі!
(*Паводле* **Н. Галіноўскай**)

## Мая лялька

Чышчу лялцы чаравікі,
Мыю белы фартушок,
Бант завязваю вялікі,
Што як жоўты матылёк.
Я вучу яе сьмяяцца,
Маляваць і размаўляць,
З мамай раніцай вітацца,
З кошкай Муркай сябраваць.
(*Паводле* **Е. Лось**)

## Рэха

Мы па лесе блукалі,
Дзіва-рэха шукалі.
Кожны раз сваім «ау!»
Мы трывожылі саву.
Наганялі страх на ўсіх:
На зайцоў і на ласіх.
Бор увесь мы абыйшлі,
Але рэха не знайшлі.
Толькі шэрае «ку-ку»
Напаткалі на суку.
(*Паводле* **М. Трафімчука**)

## Мне купілі новы мячык

Мне купілі новы мячык,
І ён скача, быццам зайчык.

Я кажу яму: «Чакай!
Ад мяне ты не ўцякай!»

Усьміхнуўся мячык, потым
Супыніўся ён пад плотам

І гаворыць: «Каб ня плот,
Паскакаў бы ў агарод!»
(*Паводле* **Я. Крупенькі**)

## У мяне ёсьць конь драўляны

У мяне ёсьць конь драўляны,
Масьці вогненна-барвянай,
Шыя у яго — дугой,
Шыя з грывай залатой.
Шоўкам вышыта вуздэчка,
На сядле гарaць насечкі,
І блішчыць яго капыт,
Быццам камень-малахіт!
(*Паводле* **І. Юкляеўскага**)



# Якая дзіўная нага!

*Госьцем нашага зьезду быў вядомы сярод паэтаў найноўшае генэрацыі Зьміцер Вішнеў. Дзякуючы мастакам Эдуарду Падбярэскаму й Уладзіміру Кузьменку ён пабываў на выставе, наладжанай ТБК, яшчэ за дзень да ейнага ўрачыстага паказу й даслаў зь Менску свае ўражаньні пра творчасьць нашых віленскіх мастакоў.*

Не сакрэт, што кожны мастацкі твор патрабуе ня толькі пэўнага асьвятленьня, аздабленьня, фону, але нават і пэўных напояў і страваў. Некаторыя творы любяць кефір і малако, іншыя гарбату й каву, а трэція наогул успрымаюць толькі піва й гарэлку. Гэта — мэтамарфоза, якая заўсёды нячутна віруе вакол тых ці іншых мастацкіх рэчаў. Мастак, ствараючы новую карціну, часьцей за ўсё й не падазрае пра тое...

Так, мне, безумоўна, пашчасьціла, што я патрапіў на выставу, калі яна знаходзілася ў стане нейкае першабытнасьці й кававасьці. Уражаньні накатваліся дробатам бубнаў. Прадстаўленая ў дзьвюх залях невялічкай галерыі Фонду культуры Літвы «AUTARE» экспазыцыя нагадвала вялікую нагу, пальцы якой можна было заўважыць у самых розных месцах: на падлозе, сьценах, сталах. На маю думку, сярод шасьці беларускіх мастакоў вылучаюцца Алег Аблажэй і Эдуард Падбярэскі, мастакі, якія балансуюць у межах сюррэалізму. Хаця ў іх зусім розныя полюсы сьветаўспрыманьня. Бо працы Аблажэя — казачныя вобразы жаночага княства, дзе кожная дзяўчына князёўна й чараўніца. Таму ўсе строі на аблажэеўскіх прыгажунях — фантасмагарычна-фэерычныя. Прычым мастак адначасна выступае тут і як казачнік, і як мадэльер, і як дызайнэр. І нават — як прадзюсар. Перад намі ня проста казачныя вобразы, а адбіткі вялікай мастацкай стужкі.

У адрозьненьні ад Аблажэя Падбярэскі ўжо шпацыруе па самай мяжы сюррэалізму й ледзьледзь не перакульваецца ў абстракцыянізм. Ягоныя акварэлі, верагодна, трэба есьці. Бо яны смачныя й маюць розныя смакі: ад трускаўкаў і ружаў да ананасаў і грэцкіх арэхаў. Мне тут прыгадаўся выпадак, калі ў Віцебску паэт Ільля Сін крыкнуў, паказаўшы рукой на малюнак Алеся Пушкіна: «Гэтага паэта я зараз праглыну!» Але ж паяданьне павінна адбывацца з дапамогаю вачэй — у гэтым своеасаблівасьць акту малюнкажэрства.



Танец. А. Аблажэй

Нягледзячы на тое, што Падбярэскі збольшага вядомы як скульптар, ён з поўным правам мог бы выдатна афармляць самыя выкшталцоныя кнігі. У акварэлях мастака можна адшукаць шмат чаго — сьпевы птушак, танцы русалак, карагоды батонаў. Падбярэскі акцэнтуе ўвагу гледача на падсьвядомасьці. Магчыма, сёньня такі ход сама аптымальны, бо чытач вобразаў выяўленчага мастацтва стаміўся ад «жоўтых бульварных карцінаў».

Станіслаў Зялёнка стварае палотны, дзе рэалізм суіснуе з пазарэальнасьцю. Несьвядомы ў жывапісе глядач можа спалохацца й прыняць краявіды мастака за магічныя знакі. Тут лірыка сябруе з прыціхлай таямнічасьцю.



Храм на Вілейцы. У. Кузьменка

Хомар дакранаецца да вас, да людзей, да машынаў, дамоў, нябастыку... І здаецца, што праз ь яго даносяцца енкі гіенаў, крумканьне крумкачоў, рыканьне гарылаў і мядзьведзяў. Фарбы наплываюць павольна, яны цьмяныя й крыху размытыя хвалямі хомару.

А калі вы аматар наведваньня віленскіх касьцёлаў ды цэркваў — працы Ўладзіміра Кузьменкі якраз для вас. Бо адзін з самых улёбёных колераў мастака — белы. Ён прысутнічае паўсюль, пераліваецца ўсімі адценьнямі й плаўна наплывае на іншыя колеры. Кузьменкавы карціны адметныя менавіта сваёю чысьцінёю й прыбранасьцю. Ягоныя працы «Белы карабель» і «Храм на Вілейцы» могуць быць лепшым аздабленьнем інтэр'еру нашых пачуцьцяў і жаданьняў.

Ёсьць у экспазыцыі й працы Андруся Балаховіча й Крыстыны Балаховіч. Першы стварае свае краявіды ў досыць рэалістычным рэчышчы, але ж, як ня дзіўна, зьяўляецца мастаком-самавукам. Гэта творца, працы якога сёньня высока каціруюцца сярод замежных турыстаў. А вось адзіная ўдзельніца выставы засталася мне амаль невядомай: яе карцінаў у галерыі пакуль яшчэ не было. Праўда, у падрыхтаваным да выставы выдавецтвам ТБК «Рунь» невялічкім буклеціку я знайшоў чорна-белае адлюстраваньне адной з працаў Крыстыны. І тыя з замілаваньнем намаляваныя гарбузы, часнок, птушачка надта спадабаліся мне.

**Зьміцер Вішнёў**
*адмыслова для газэты «Рунь»*



На выставе «Беларускія мастакі»

### Шчыра дзякуем за ахвяраваньні

**Анатолю Бразоўскаму**, выпускніку Віленскага ўнівэрсытэту 1939 г. з Аўстраліі,
**Кастусю Акуле** з Канады,
**Чэславу Мекіну** з Польшчы,
**Генадзю Леху** з Масквы,
**Але Орса-Романо** з Амэрыкі,
**Сп. Баяроўскаму** з Англіі,
**Васілю Еўдакімаву** з Англіі,
грашыма якога былі пакрытыя друкарскія выдаткі гэтага нумару.

**Меркаваньні рэдакцыі не заўсёды супадаюць з пазыцыяй аўтараў.**

### Умовы падпіскі

Як мы ўжо паведамлялі чытачам далёкага замежжа, да нас з найменшымі стратамі даходзяць імянныя чэкі. Дасылайце іх на адрас рэдакцыі на імя старшыні ТБК Хведара Нюнькі (Fiodor Niunka) або галоўнаму рэдактару Алегу Мінкіну (Oleg Minkin). Кошт падпіскі на год — 20 даляраў.

Жыхары Літвы могуць падпісацца ў памешканьні рэдакцыі або ў кожным аддзяленьні сувязі. Падпісны індэкс газэты — 0187. Кошт падпіскі — 12 літаў.

Нашым патэнцыяльным падпісчыкам у Беларусі паведамляем нумар тэлефону ў Менску:
0172 71 16 34

РУНЬ газэта беларусаў Літвы
выходзіць адзін раз на месяц
заснавальнік і выдавец
Таварыства Беларускай Культуры ў Літве
адрас рэдакцыі:
2001 Vilnius, Žygimantų 12-3
тэлефоны: 61 65 32, 42 38 02
друк: АТ «Спаўда»
замова ___
наклад 1000 асобнікаў
Сябры рэдакцыі:
Алег Мінкін - галоўны рэдактар
Алег Аблажэй - мастацкі рэдактар
Віктар Корзун - макет і вёрстка
Сяргей Вітушка - гісторыя й этнаграфія
Павал Саўчанка - падпіска й распаўсюджаньне